# ЯК ТЫ ДА ЛЮДЗЕЙ, ТАК І ЛЮДЗІ ДА ЦЯБЕ



**Мы працягнем чытаць** творы пра ўзаемаадносіны людзей і іх учынкі, пра значэнне ветлівасці і добразычлівасці ў жыцці.

**Мы будзем вучыцца:**

- ✓ знаходзіць у творах апісанне дзейнай асобы;
- ✓ вызначаць рысы характару персанажаў;
- ✓ вызначаць тэму, фармуляваць асноўную думку твораў;
- ✓ вылучаць сэнсавыя часткі апавядальнага твора, вызначаць галоўнае ў кожнай частцы;
- ✓ падрабязна пераказваць змест казак і апавяданняў з гэтага раздзела.

**Варта задумацца.** Чаму патрэбна быць ветлівым і добразычлівым чалавекам?



Правообладатель Национальный институт образования

## ЭДЗІ АГНЯЦВЕТ

# Вельмі «ветлівы» Мікіта

У спякоту або ў студзень
Між палёў і гарадоў
Людзі ўсе ідуць як людзі:
— Добры дзень!
— Салют!
— Здароў!

Усміхнецца той другому —
І абодвум весялей.
Толькі ён выходзіць з дому,
Як гусак ці Бармалей.

І надзьмуты, і сярдзіты
Вельмі «ветлівы» Мікіта!
Ён паклаў свой «добры дзень»
У партфель або ў кішэнь?

І каго ён пераймае?..
У дрымучых джунглях слон
Галавой слану ківае —
Аддае і слон паклон.





Правообладатель Национальный институт образования



А як звонка ў пушчы нашай!
Берасцянка: — Цінь-цінь-цень!
— Добры дзень! — шчыгол адкажа.
Праўда, пень маўчыць як пень.



І надзьмуты, і сярдзіты
Вельмі «ветлівы» Мікіта!
Ён паклаў свой «добры дзень»
У партфель або ў кішэнь?

1. Як аўтар ставіцца да свайго персанажа?
2. Каго Эдзі Агняцвет прыводзіць у прыклад хлопчыку? Падмацуйце адказ радкамі з твора.
3. Як вы разумееце сэнс слоў:

   Ён паклаў свой «добры дзень»
   У партфель або ў кішэнь?

4. Што вы параілі б Мікіту пры сустрэчы?
5. На якую тэму напісаны верш?
6. Якая асноўная думка гэтага твора?
7. Разгледзьце ілюстрацыі да верша. Абмяркуйце, якія яшчэ малюнкі можна зрабіць да твора.
8. Падрыхтуйце выразнае чытанне верша.

Прачытайце прыказку. Як вы разумееце яе сэнс?

- Добрая слава ў кошыку ляжыць, а благая — па дарожцы бяжыць.



Правообладатель Национальный институт образования

**Маўленчая размінка.** Прачытайце скорагаворкі. Правільна вымаўляйце гукі [р], [ч].

## СКОРАГАВОРКІ

- У **ч**аплі **ч**апляня, у зайкі зай**ч**аня.
- Т**р**ы д**р**ывасекі на т**р**ох два**р**ах д**р**овы сякуць.




***Ула́шчаныя*** (жабкі) — задобраныя.
***Заве́сці сваю́ валы́нку з катры́нкай*** — пачаць дакучлівую размову, гаварыць адно і тое ж.
***Вір*** — глыбокае месца ў рацэ з водаваротам.
***Ла́яць*** — тут: называць грубымі, зняважальнымі словамі, ганьбіць.

## УЛАДЗІМІР КАРАТКЕВІЧ

## Жабкі і Чарапаха

(Скарочана)

На беразе маленькага ляснога возера-балотца разгарла́ліся, разышліся і наладзілі канцэрт жабы. Церушыў на іхнія галоўкі цёплы дожджык, свяціла праз яго сонца. Весела было жабкам — вось яны і спявалі.

І тут прыплыла з такога самага суседняга балотца-возера вялікая балотная Чарапаха. Жыла



Правообладатель Национальный институт образования